Слова для Жыцця (172)

Аўтар: Рэдакцыя
21.10.2018 00:00



Папа Францішак

У кожным хворым дзіцяці, у кожным адчайным мігранце, у кожным крохкім жыцці, жыцці, якому пагражаюць, Хрыстос шукае нас, шукае нашага сэрца, каб раскрыць радасць любові. Той, хто здаецца праблемай, на самой справе з'яўляецца Божым дарам, які можа выцягнуць з эгацэнтрызму і дазволіць узрастаць у любові. Уразлівае жыццё ўказвае нам выйсце, шлях, каб пазбавіцца ад засяроджанага на сабе існавання.

Мы павінны сказаць усім людзям у свеце: не пагарджайце жыццём! Не пагарджайце жыццём іншых і ўласным. Вялікай колькасці моладзі трэба сказаць: не пагарджайце сваім жыццём! Перастаньце выракацца Божай справы! Ты – справа Божая! Не недаацэньвай сябе, не пагарджай сабой праз розныя залежнасці, якія ламаюць дух і вядуць да смерці. […] Нельга пагарджаць тым, што Бог палюбіў! А Ён так палюбіў свет, што аддаў Сына свайго Адзінароднага, "каб кожны, хто верыць у Яго, не загінуў, але меў жыццё вечнае" (Ян 3, 16).

Фрагмент прамовы падчас агульнай аўдыенцыі ў Ватыкане, 10.10.2018 †

Слова для Жыцця (172)

Аўтар: Рэдакцыя
21.10.2018 00:00



[redacted]